Творчая дзейнасць, уключаючы права на індывідуальны выбар, была пастаўлена перад фактам сапраўдных каштоўнасцей, існуючых як унутры нацыі, рэлігіі, так і ў сусветнай культуры. Плюралізм культурных сітуацый змяніў статус нацыянальнай мовы і традыцыі, іх суадносіны з этнічным, архаічным пластом культуры праз сродкі цывілізацыі (кантакт, камунікацыя, абмен і г.д.) і выклікаў да жыцця эрзацкультуру, субкультурныя і контркультурныя працэсы.

Менавіта гэта з усёй вастрынёй паставіла праблему сапраўднай культуры, культурнай ідэнфікацыі і трансфармацыі каштоўнасцей, праз якія генерыруецца і рэгенерыруецца інтэлігентнасць.

**Дарашэвіч Э.К.**, *прафесар*

## ДЫЯЛОГ ЯК ПРЫНЦЫП КУЛЬТУРАЛОГІІ

Дыялог як форма суразмоў'я вядомы яшчэ з часоў антычнасці. Класікай гэтага жанру прынята лічыць дыялогі Платона, падробкі пад якога былі вельмі распаўсюджаны. Але з цягам часу яны захаваліся толькі ў мастацкай літаратуры. Высока ставіў сутнасць дыялагічнага супастаўлення думак Георг Вільгельм Фрыдрых Гегель, аднак адмаўляўся ад дыялога Платона.

М.М.Бахцін, звярнуўшыся да дыялога як мастацкага метаду (аналіз творчасці Ф.М.Дастаеўскага), разгортвае і даводзіць яго да культуралагічнага прынцыпу. Некаторыя падыходы да універсальнай трактоўкі дыялога ўзніклі ўжо у віцебскі перыяд жыцця і творчасці выдатнага вучонага.

Сутнасць канцэпцыі дыялога выяўляецца у кнізе аб Дастаеўскім («Проблемы творчества Достоевского», 1929), дзе ў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

канкрэтным аналізе творчасці вялікага рускага пісьменніка высвечваюцца поліфанічнасць, розныя формы дыялога, разам з тым адзначаецца, што прынцып пабудовы паўсюдна адзін: «пересечения, созвучие или перебой реплик открытого диалога с репликами внутреннего диалога. Повсюду определённая совокупность идей, мыслей и слов проводится по нескольким неслиянным голосам, звуча в каждом по-иному» (гл.: Бахтин М.М. Эстетика словесного творчества. М., 1979 ,.— С.186).

Бахцін бачыў спецыфіку поліфаніі і дыялагічнасці твораў Дастаеўскага як гучанне розных галасоў і не столькі знешніх, колькі асабістых (у душы). Пры гэтым Бахцін паказвае прынцыповае адрозненне дыялога Платона ад дыялога Дастаеўскага. У Платона ўсё сінтэзуецца ў ідэі, якая дамінуе над жыццём, а ў Дастаеўскага дамінуюць галасы жыцця. З пасціжэння мастацкай творчасці геніяльнага пісьменніка Бахцін вывеў прынцып дыялога як зыходны прынцып спасціжэння мастацкай культуры, паступова ўсё глыбей і глыбей інтэрпрэтуючы яго.

Спачатку вучоны трактуе дыялог праз паняцце «поліфанія», якое можна трактаваць як узаемадзеянне «шмат якіх галасоў». Гэты тэрмін прыняты сучасным літаратуразнаўствам. У працэсе творчай працы сфармуляваны Бахціным прынцып і яго паслядоўнікамі каардынуецца з канцэпцыямі карнавалу і карнавалізацыі і з канцэпцыяй хранатопу. У сучаснай гуманітарнай навуцы гэтыя канцэпцыі шырока прынятыя, на іх абапіраюцца і іх распрацоўваюць не толькі ў літаратуразнаўстве, але і ў шырокім комплексе навук аб культуры. Яны набылі не толькі акадэмічны высокі імідж, але і ў шырокім спектры даследаванняў культуры, у тым ліку штодзённай (этнічнай, стратавай і інш).

Асновы дыялагічнасці ўзніклі у філасофіі (Ясперс, Бубер, Франк і інш). Бахцін праз філасофскае асэнсаванне рухаецца да культуралагічнай канцэпцыі, да «диалоговедения».



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Філасофскія асновы дыялога ўключаюць бясконцую складанасць быцця і чалавечага духу. Дыялагічнасць быцця чалавека ў непаўторнасці кожнай асобы, магчымасць дыялога абгрунтавана «адчыненасцю», добразычлівасцю, узаемаразуменнем, любоў'ю да чалавека. Сапраўдны дыялог, такім чынам, мае маральную аснову (увагу, чалавечнасць, сціпласць, прыняцце вышэйшых мэт і каштоўнасцей і інш.), нават вышэйшую духоўную арыентацыю. Усё гэта прасочвалася і да Бахціна. Новае ж, як нам здаецца, у раскрыцці універсальнасці дыялога не як сферы высокай філасофскай абстракцыі (як у Платона і інш.), а ў жыцці як стыхіі, у будзённым жыцці з яго звычайнымі людскімі перажываннямі. А.Б.Дзямідаў пісаў: «Поэтому М.М.Бахтин нашёл в сочинениях Достоевского наиболее подходящие модели для философского осмысления феномена диалога. Бахтин характеризует творчество Достоевского словом «диалоговедение», однако, мы можем заметить, что писатель, скорее, моделировал художественными средствами диалоги, а исследование («ведение») их как предмета научного анализа осуществлено уже Бахтиным. Таким образом, термин «диалоговедение» более подходит к творчеству самого Бахтина». Далей даюцца асновы дыялагічнасці. Трэба коротка ўзгадаць такія сутнасныя элементы дыялога, паводле Бахціна, як «завершение» личности с позиций вненаходимости, интенции к раскрытию «внутреннего человека», идея как бытийственное общение людей в живом событийном пространстве и времени».

Мы гаворым аб магчымасцях выкарыстання метадалогіі Бахціна, якая трактуецца дастаткова шырока і вольна. Дыялог мы разумеем як вельмі шырокае паняцце спасціжэння культуры, як правамоцнасць розных «галасоў» у культуры, як «шматгалоссе» свету культуры, бясконцай складанасці індывідуальнасці і жывой сапрысутнасці з намі.

Прынцып дыялога карэліруе з канцэпцыямі карнавалу і хранатопу, кожны з іх генерыруе шмат з'яў культуры. Адкрытасць дыялога зразумелая: яна абгрунтавана самой сутнасцю



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прынцыпу — павагай да ўсялякай асобы і яе думак. Не выпадкова таму канцэпцыя дыялога параўноўваецца з прынцыпам дапаўняльнасці Нільса Бора, які прапанаваў у Эльсіноры распаўсюдзіць гэты прынцып на гуманітарныя навукі.

Прынцыпы дыялога і дапаўняльнасці блізкія па іх гуманістычнаму зместу, іх маральнай аснове: трэба ўважліва выслухаць розныя думкі (розныя галасы), не душыць адзін аднаго, а «дапаўняць». Жыццё, творчасць, асоба Бахціна — пацвярджэнне гэтаму.

Трэба адзначыць, што філасофскі змест канцэпцыі дыялога (дыялагічнасці, поліфанічнасці, шматгалосся) апошнім часам з'яўляецца прадметам даследавання шэрага аўтараў. Сярод іх мы вылучаем працы Н.К.Банецкай, шмат якіх друкуюцца ў выданнях Віцебска. Гэтыя публікацыі даюць надзею на тое, што на Беларусі будзе і далей распрацоўвацца важны прынцып культуралогіі і культуразнаўства. Яго распрацоўка патрэбна не толькі ў філасофіі, але таксама ў шырокай сферы культуры (так званыя cultural studies, у якіх ужо акрэслены магчымасці такога выкарыстання, гл., напрыклад, The Cultural Studies READER. Edited by Simon During. London and New York, 1994, p.16,66,271, 284, 287, 291; James Clifford. Traveling Cultures / Cultural Stadies, Ed. Lawrence Grossberg Routledge. New York, London, 1992, p.99).

Выкарыстанне прынцыпу дыялога ў дачыненні да нашай культуры можа быць вельмі плённым. Наша культура была і ёсць дастаткова складаная, ёсць, так сказаць, дыялог у самой рэчаіснасці (можа, «анталагічны» дыялог), таму яго выкарыстанне як прынцыпу даследавання — зусім натуральная справа.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ